...ТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

...ЫРВОНАЯ ...ЗЬМЕНА

...АН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

19 сьнежня 1931 г. № 305 (1560)

33 проц. мала!

...ерш-на-перш аб лічбах: на ...сьнежня квартальны плян на... ...ток дзелавога дрэва выканан ...55 проц., вывезена толькі ...проц.

...а гэты-ж дзень квартальны ...н дрованарыхтовак выканан 55 проц., вывезена 11,6 проц. ...эты лічбы сьведчаць аб ганеб... ...арыве ў лесе, аб злачын... ...выкананьні плянаў дрова... ...нарыхтовак, аб усім веда... ...чаным стане вывазкі лесу.

...а лясную гаспадарку зараз ...ладзены вялікія абавязкі. Лес ...іне забясьпечыць будаўніцтва ...ых фабрык і заводаў, даць апал ...рочых кватэр, школ і куль... ...ных установ, чым у значнай ...ы забясьпечыць выкананьне ...на гэтага гаспадарчага году.

...а заводак выкананьня плянаў ...азі і нарыхтоўкі дроў і лесу ...іна быць прыцягнута ўвага ...ролетарскай грамадзкасьці, ...ацьці за кожны лішні процант ...ананьня плянаў павінна лічыцца ...ым абавязкам кожнага рабо... ...а, лесаруба, кожнага колгасьніка, ...на комсамольца ў першую ...гу.

...ес патрабуе да сябе ўвагі. На ...ым фронце патрэбна такая-ж ...вая ломка, якая ў свой ...пры націску ўсяго пролетарыяту ...кіраўніцтвам партыі адбылася ...на... Донбасу.

...Чым раней адбудзецца гэта ...катым лепш, бо да канца ...кварталу засталіся лічаных ...ы 2 дзён.

...ачы яшчэ вялікія. Недаказаньне плянаў кварталу га... ...на... плямаю кладзецца на ўвесь ...саюз і комсамол леспрамгасаў ...першую чаргу.

...Шляхоў для перамог багата. ...Трэба пераключыцца на гэты ву... ...тагаму, што ён рашае. Трэба ...ь прамысловасьці сыравіну, з ...очы апал чаго-б гэта ні каш...

...Перад намі 2 шляхі. Першы: ...овіца ад дапатопных мэтодаў ...ць даць пуцёўку ў лес мэха... ...му. Мэханізмам штурмаваць лес! ...угі: адмовіцца ад старой, уста... ...ленай стагодзьдзямі сыстэмы арганізацыі працы. Мы ня можам і не павінны працаваць так, як працавалі дзяды і прадзеды!

Брыгадны мэтод пакласьці ў аснову ўсёй арганізацыі працы. Чаму хваля соцспаборніцтва і ўдарніцтва так слаба закранула лес? Хіба ня ў выніку слабой арганізацыі працы толькі 33 проц. лесарубаў ахоплены брыгадным мэтодам?

Лес адстаў ад нашага сёньня, лес не працуе мэтадамі, вартымі пэрыоду соцыялізму.

Задача ўсяго комсамолу ў тым, каб дабіцца поўнага выкананьня плянаў. Трэба ўсебакова правесьці ў жыцьцё ўказаньні т. Сталіна, на падставе арганізаванага набору рабочае сілы, дабіцца брыгаднага мэтаду работы, правільнай расстаноўкі сілы, а ў сувязі з гэтым — карэннай ліквідацыі абязьлічкі ў рабоце і ўраўнілаўкі ў зарплаце.

Рашаючую ролю адыгрывае палепшаньне матар'яльных умоў працы лесарубаў. Гэты вучастак застаецца вузкім месцам. У свой час комсамол правёў вялікую работу па палепшаньню грамадзкага харчаваньня на лесасплаве. Зараз неабходна аднавіць добры вопыт у практыцы нашай работы. Палепшыць харчаваньне, забясьпечаньне і культурнае абслугоўваньне лесарубаў — наставіць гэту работу ў парадак дня раённага камітэту комсамолу і кожнай комсамольскай ячэйкі.

Трэба дабіцца пералому і ў наборы рабочай сілы. Зараз, больш чым калі раней, пры ўмовах правільнай арганізацыі працы ў колгасах могуць быць вылучаны тысячы новых лесарубаў. новых брыгад на штурм лясоў.

Комсамол паказаў не адзін прыклад ударніцтва на лясным фронце.

Па Заслаўскай комсамоліі, якая ўзяла на сябе рад абавязкаў і, трэба спадзявацца, па-ўдарнаму іх выканае, павінны раўняцца ўся арганізацыя.

На прыкладзе перадавых, на глебе ўказаньняў т. Сталіна перабудаваўшы работу ў лесе, ударна правядзем 1-ы маршрут эстафэты і падрыхтуемся да другіх. Вернем краіне лясны доўг.

У дні ўсесаюзнага сталінскага

Выязная рэдакцыя „Чыр. Зьмены" у Віцебску

Напярэдадні 4-га пленуму ЦК ЛКСМБ

У ролі маўклівага наглядальніка

Комсамольскі камітэт ф-кі „Сьцяг Індустрыялізацыі" ня кіруе сталінскім паходам

Зьнішчыць стаўку на самацёк

Абвешчаны „Комсамольскай праўдай" і падхоплены ўсёй комсамольскай арганізацыяй сталінскі паход не адразу ўзварушыў комасамольскую арганізацыю фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі".

На фабрыцы працуе 1700 комсамольцаў, а камітэт ЛКСМБ ня мае конкрэтнага пляну па рэалізацыі 6-ці ўмоў т. Сталіна.

Толькі зараз комсамольская арганізацыя фабрыкі прыступіла да перабудовы сваёй працы. Цэнтр цяжару пераносіцца ў цэх, брыгаду і групу. Організоўваюцца вучастковыя ячэйкі пад непасрэдным кіраўніцтвам комітэту.

Хаця ў камітэце няма належнага плянаваньня, зрух і ў галіне ажыцьцяўленьня прамовы Сталіна ёсьць.

Па ініцыятыве комсамольскай организацыі на фабрыцы організаваны 24 маладзёжныя гаспадарча-разрахунковыя брыгады. Брыгады паказваюць прыклады бальшавіцкіх тэмпаў у барацьбе за прамфінплян. 5-я бручная істужка пасьля організацыі 3-х гаспадарча-разрахунковых брыгад перавыконвае прамфінплян. Брыгады ўцюжнага цэху так сама перавыконваюць плян.

Фабрычная організацыя слаба кіруе гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі. Плянавы сэктар не паказвае брыгадам як паставіць вучот працы. Аднак, ня гледзячы на гэта значна павялічылася колькасьць плянава-опэрацыйных груп на фабрыцы. Група 8-й комсамольскай стужкі, увёўшы зьменна-сустрэчныя пляны, устанавіла ўсесаюзны рэкорд: у адну зьмену дала 1003 адзінкі, замест 850 па пляну. „Сакрэт" перамог—у бальшавіцкай настойлівасьці і энтузіязьме комсамольцаў 8-й істужкі.

Старшыня вытворчага сэктару профкому, тав. Альтман, кажа, што плянава-опэрацыйныя групы не патрэбны, іх варта замяніць камісіямі па пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак. Па гэтай думцы фабком ня ўдарыў. Падобныя „тэорыі" у фабкоме трываюць і па сёньняшні дзень.

У галіне палепшаньня бытавых умоў рабочых камітэтаў ЛКСМБ заключыў дагавор з ЗРК. Кожная ячэйка прымацавана да крамы. Камітэт узяў шэфства над фабрычнай сталоўкай.

Але трэба адзначыць, што дагавор паміж ЗРК і камітэтам ЛКСМБ ня выконваецца, дагавор не даведзен да цэх'ячэек. Таму комсамольцы ячэек, мала ведаючы аб гэтым дагаворы, нічога ня робяць. Шэфства камітэту ЛКСМБ над сталовай засталося на паперы.

Перад комсамольскай організацыяй фабрыкі „Сьцяг індустрыялізацыі" стаяць адказныя задачы: біцца за далейшую ліквідацыю абязьлічкі і ўраўнілаўкі, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку, за палепшаньне бытавых умоў рабочых, за прапрацоўку кантрольных лічбаў на 1932 год. З посьпехам выканаць плян 3-га рашаючага і без запазычанасьці ўступіць у 4-ты год пяцігодкі.

Ударная брыгада „ЧЗ": Б. Зэлікзон, Н. Абэзгаўз.

Комсамольцы—барацьбіты за ўкараненьне электрозваркі

Комсамольская організацыя заводу „Чырвоны мэталіст" (Віцебск) за час падрыхтоўкі пленуму дабілася значных перамог у рэалізацыі 6-ці ўмоў, высунутых т. Сталіным.

Па ініцыятыве ячэйкі ЛКСМБ такарнага цэху організована 12 гаспадарча-разрахунковых брыгад. Гэтыя брыгады паказваюць ударныя тэмпы працы. Брыгада Фінкеля сыстэматычна выконвае прамфінплян на 125—130 проц. Маладзёжная брыгада Белева за апошні месяц заданьне выканала на 110 проц. Комсамольская ячэйка такарнага цэху змагаецца за ахоп гаспадарчым разрахункам усіх станкоў, на якіх працуе моладзь.

Калі да пачатку сталінскага паходу ўдарніцтвам было ахоплена 45 проц., дык зараз 77 проц. Комсамольцы-навічкі Эпштэйн (фармаўшчык), Гувелеў (сьлесар), Рыўкіна (отапочніца) сыстэматычна перавыконваюць свае заданьні.

Дзякуючы комсамольцам усе кляпальныя конструкцыі бульбакапалкі пераведзены на электразварку, што дало вялікую экономію ў рабочай сіле.

Таксама пераведзены на электрозварку некаторыя дэталі жмыхадрабілкі, камнярэзкі і большасьці кляпальных конструкцый плуга „Эбэргард". Увесь цэх акомсамолены. На заводзе організованы 4 плянава-опэрацыйныя групы, якія ўзмоцнена рыхтуюцца да 1932 году.

У час сталінскага паходу сабрана па комсамольскім колектыве 32 рацыяналізатарскія прапановы, з якіх прынята 22 на экономію ў 2700 руб. У мэханічным цэху організавана рацыяналізатарская брыгада.

Ня гледзячы, аднак, на гэтыя дасягненьні ў рэалізацыі 6 умоў т. Сталіна ёсьць рад недахопаў. Гаспадарча-разрахунковыя брыгады яшчэ не наладзілі сталага вучоту працы. Яшчэ ня ўсе комсамольцы ахоплены гаспадарчым разрахункам. Не організована 8-я гадзіна тэхнічнай вучобы. Тэхнічнай вучобай ахоплены ня ўсе комсамольцы. У такарным, мэханічным і абрубачным цэхах ня зьнішчана канчаткова ўраўнілаўка. Да гэтага часу на заводзе не організована ніводнае бытавое комуны.

Пад кіраўніцтвам партыйнай організацыі комсамольскі колектыў заводу к канцу паходу павінен зьнішчыць усе гэтыя недахопы.

Брыгада „Ч. З." Фінкель, Нэман, Ватнікаў.

Сёньня роўна а 6-й гадз. увеч.,

у памяшканьні Дому Навукі і Тэхнікі

(Комсамольская, 25)

СКЛІКАЕЦЦА АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД

актыву Менскай організацыі ЛКСМБ

ПАРАДАК ДНЮ:

1. ВЫНІКІ ПЛЕНУМУ ЦК УсеЛКСМ.

Своечасовая яўка сэкратароў і сяброў бюро камітэтаў, колектываў і ячэек—абавязкова.

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ ЯНКОВІЧ

Рашаючыя дні павінны прынесьці перамогу

Комсамолія Старых Дарог, Петрыкава, Кармы, Лельчыц і Любані, узмацняй тэмпы барацьбы за хлеб!

Да 1-га студзеня плян збожжазаготовак выканаць поўнасьцю



Плян збожжазагатовак па Беларусі на 15 сьнежня выканан толькі на 9,2 проц., што тармозіць справу соцыялістычнага будаўніцтва. Партыя і ўрад ня раз давалі выразныя дырэктывы аб выкананьні плянаў збожжазагатовак поўнасьцю і ў тэрмін.

Рад раённых організацый, якія сапраўды па-бальшавіцку змагаліся за тэмпы збожжазагатовак, дасягнулі бальшавіцкіх посьпехаў. Так, Гомельскі, ...сьвейскі, Сураскі выканалі і перавыканалі пляны. Раёны: Бешанковіцкі, Гарадоцкі, Лёзьненскі, Мсьціслаўскі, Уваравіцкі і інш. набліжаюцца да выкананьня. Сакрэт перамог гэтых раёнаў у тым, што партыйныя, савецкія і комсамольскія організацыі, здолелі сваёй ударнай бальшавіцкай работай сярод мас колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства організаваць гаспадарча-політычную работу на збожжазагатоўках, здолелі разьбіць кулацка-месьніцкія настроі ў колгасах і саўгасах, зрабіць рашучы наступ на кулацка-заможныя гаспадаркі і гэтым самым забясьпечылі ўдарныя тэмпы ў нарыхтоўках, давёўшы поўную рэальнасьць плянаў.

Рад раёнаў усё-ж ганебна плянецца ў хвасьце Так, на 11 сьнежня Старадарожскі раён плян збожжазагатовак выканаў толькі на 26 проц., Мазырскі 39,9 проц., Петрыкаўскі 42,8 пр., Камарынскі 43,6 проц. Лельчыцкі 34 проц., Любаньскі 45,9 проц. У чым „сакрэт" ганебнага адставаньня гэтых раёнаў? У тым, што раённыя і мясцовыя кіруючыя організацыі не ўзялі бальшавіцкіх тэмпаў, не разьбілі кулацка-месьніцкія настроі, якія зьвілі сабе гняздо ў многіх саўгасах і колгасах, ня выкарысталі мэтодаў с праўды бальшавіцкай, упартай выхаваўчай работы сярод мас колгасьнікаў беднякоў і серадзякоў, не зламалі кулацкі сабатаж у збожжазагатоўках, не далі рашучага адпору разважаньням аб „нерэальнасьці" плянаў.

Паводле дырэктыў партыі і ўраду, плян збожжазагатовак павінен быць поўнасьцю выканан к 1-му студзеня 1932 г. Комсамольскія організацыі асабліва адстаючых у збожжазагатоўках раёнаў, павінны па-ўдарнаму мобілізавацца на ліквідацыю прарыву, з тым, каб рапартаваць пленуму ЦК ЛКСМБ аб поўнай перамозе на гэтым фронце.

Што трэба зрабіць, каб выканаць плян у бліжэйшыя дні?

Па-першае, саўгасныя ячэйкі павінны выкарыстаць ўсе вартыя комсамолу мэтоды бальшавіцкай работы, дабіўшыся таго, каб саўгасы у організаваным парадку здалі дзяржаве вызначаную плянам збожжавую продукцыю. Трэба ўдарыць з ўсёй рашучасьцю па дробна-буржуазных становішчах ...жаньнях лініі партыі, якія мелі і маюць яшчэ месца у некаторых саўгасах.

Па-другое, у парадку выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай трэба дабіцца каб колгасы здалі (прадалі) вызначаную заданьнем продукцыю. Трэба растлумачыць масам колгасьнікаў, што нельга ні у якім разе дапусьціць такога становішча, калі некаторыя колгасы ў першую чаргу разьмяркоўваюць збожжа паміж сваіх членаў, а потым ужо выдзяляюць для продажу дзяржаве.

Заводы ў 1931 г, далі вёсцы на 768 млн. руб. трактароў і машын, на 146 млн. угнаенчня, на 1 мільярд крэдытаў і г. д. Адгэтуль рабочая кляса мае права патрабаваць ад колгасаў першачарговага выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Гэта павінна быць шырока растлумачана сярод усіх колгасьнікаў, беднякоў і серадзякоў.

Па-трэцяе: зламаць кулацкі сабатаж ў збожжанарыхтоўках і прымусіць кулака здаць дзяржаве вызначаную па цьвёрдых заданьнях продукцыю.

Па-чацьвертае: на аснове шырокай растлумачальнай работы сярод беднякоў і серадзякоў аднаасобнікаў дабіцца выкананьня імі прынятых у парадку самаабавязацельства пляну нарыхтовак і дагавароў па кантрактацыі.

Комсамольскія організацыі, па прыкладу перадавых раёнаў, павінны сваёй упартай бальшавіцкай работай мобілізаваць масы колгасьнікаў і аднаасобнікаў на поўнае выкананьне плянаў збожжазагатовак к 1-му студзеня 1932 г.

„У нас ёсьць усе даныя, каб плян загатовак выканаць поўнасьцю і ў тэрмін. Трэба толькі па-баявому ўзяцца за працу". („Зьвязда").

С. М.

Песьняру пролетарскай барацьбы

Дарагі таварыш Александровіч!

Шчыра вітаю Вас з дзесяцігадовым юбілеем літаратурнай працы.

Пройдзены Вамі шлях красамоўна сьведчыць аб тым, што адзінай крыніцай творчай дзейнасьці пролетарскага поэты зьяўляецца барацьба рабочае клясы пад кіраўніцтвам компартыі за соцыялізм, што пролетарскі поэт дасягае вышэйшага разьвіцьця сваёй творчай дзейнасьці толькі пры ўмове непасрэднага ўдзелу ў практычнай барацьбе за соцыялізм.

Вы былі адным з тых, хто пад кіраўніцтвам партыі зразумеў клясава-варожую сутнасьць нацыянал-дэмократызму і яго агентуры ў партыі—нацыянал-опортунізму і ўступіў у барацьбу за ленінскае ажыцьцяўленьне нацполітыкі, у змаганьне супроць праў шовінізму і опортунізму.

Ваш творчы талянт знаходзіцца на вышыні росквіту. Трэба дамагацца таго, каб гэты талянт быў цалкам скарыстаны для пераможнай бальшавіцкай барацьбы на конкрэтных вучастках соцбудаўніцтва, для перамогі ідэі марксызма-ленінізму,—генэральнай лініі партыі.

Выказваю ўпэўнасьць, што бальшавіцкая закалка, атрыманая Вамі за мінулы час забясьпечвае пасьпяховасьць Вашай далейшай літаратурнай дзейнасьці пролетарскага поэты. **А. Чарвякоў**

17 сьнежня 1931 г. г. Менск.

Аўтару „Цені на сонцы“—

Пісьменьніку, менаппаўцу тав. Александровічу А.

Дзякуючы шырокаму разгортваньню соцыялістычнага будаўніцтва і культурнай рэволюцыі разьвіваецца і ўмацоўваецца пролетарская па зьместу і нацыянальная па форме культура.

Літаратурны фронт і ўвесь фронт мастацтва наогул мае вялікае значэньне, асабліва ў рэконструкцыйны пэрыод. Перад пролетарскім літаратурным рухам, які разгортваецца пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, станць вялікія задачы стварэньня сапраўднага мастацтва бальшавізму. Пролетарскі мастак павінен аўладаць марксыцка-ленінскім сьветапоглядам і мэтадалёгіяй з тым, каб творчасьць пролетарскага пісьменьніка яскрава адбівала эпоху пролетарскай соцыялістычнай рэволюцыі, эпоху гэроічнай будоўлі соцыялізму ў нашай краіне, каб яна (творчасьць) мобілізавала масы на барацьбу за генэральную лінію нашай партыі, на выкананьне задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Сіла пролетарскай літаратуры ў яе інтэрнацыянальным клясавым адзінстве. Змаганьне з ўхіламі вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з нацыянал-дэмократызмам—гэтай агентурай фашыстаўскіх інтэрвэнтаў, з шовінізмамі іншых колераў, барацьба за ідэолёгічную вытрыманасьць літаратурнага фронту, барацьба за партыйнасьць у літаратуры — гэта ёсьць першачарговыя абавязкі пролетарскага пісьменіка БССР.

Вітаю з дзесяцігадовым юбілеем літаратурнай дзейнасьці. Жадаю далейшай пасьпяховай працы і барацьбы за гегемонію пролетарскай літаратуры. **М. Галадзед.**

На выстаўцы „Пісьменьнік і соцыялістычнае будаўніцтва“ у Доме Пісьменьніка. На фото: беларускі пролетарскі поэта, адказны сэкратар МенАПП т. А Александровіч (у цэнтры) ля аддзелу, прысьвечанага яго літаратурнай чыннасьці.

Абавязкі дакажэце справа

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ РЭГУЛЯРНАЕ ФІНАНСАВАНЬНЕ 4-га ЗАКЛЮЧНАГА

У разгортваньні фінэстафэты і ўсёй работы па мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў краіны комсамольскія раённыя організацыі, па прыкладу комсамоліі Кармяншчыны, павінны ўзяць на сябе рад практычных абавязацельстваў і няўхільна ажыцьцяўляць іх.

Неабходна організаваць комсамольскія ўдарныя фінбрыгады, якія павінны стаць перадавікамі фінэстафэты.

З усёй рашучасьцю неабходна павесьці барацьбу з тымі, хто ігноруе, ці недаацэньвае мерапрыемствы фінэстафэты і ўхіляецца ад практычнага іх выкананьня.

У Барысаве задаволены самацёкам

Плян мабілізацыі сродкаў на першае сьнежня г. г. па Барысаве выканан на 45,7 проц. Па пазыцы і ўкладах у ашчадкасы заданьне выканана на 30,7 проц.

З усёй рашучасьцю трэба адзначыць, што пастанова аб стопроцантным ахопе падпіскай на пазыку ўсіх рабочых і служачых гораду ня выконваецца.

Напрыклад, рабочыя і служачыя „Домбаля“ падпісаліся на пазыку на 87 тысяч руб., а аформлена на 43 тысячы. Бэрэзінскі комбінат падпіску аформіў на 94 тысячы руб., „Комінтэрн“—43 тысячы руб.

Такія факты прымушаюць констатаваць, што партыйныя і комсамольскія організацыі прадпрыемстваў у галіне мобілізацыі сродкаў ганебна плятуцца ў хвасьце. Неабходна з усёй рашучасьцю ліквідаваць адставаньне. Плянавае заданьне павінна быць па-бальшавіцку рэалізавана.

Э. А.

Мізэрныя вынікі—паказчыкі фінработы на Случчыне

Між тым,стан мобілізацыі сродкаў у Слуцкім раёне прымушае біць трывогу: выканан толькі на 57,1 проц.

Асабліва ганебна праходзіць мобілізацыя сродкаў праз ашчадкасы, Па пляну неабходна мобілізаваць 194 тысячы руб., за апошні час мобілізавана 68697 руб.

Такое недапушчальнае адставаньне тлумачыцца опортуністычнай недаацэнкай працаўнікоў ашчадкас і іншых організацый, важнасьці мобілізацыі сродкаў.

Па ўцягваньню новых укладчыкаў у касы зараз не праводзіцца ніякай работы. Работнікі ашчадкас зьяўляюцца толькі мэханічнымі прыёмшчыкамі ўкладаў, супакойваюцца на мізэрных дасягненьнях.

Пасобныя сельсаветы таксама ігноруюць мобілізацыю ўвагі мас вакол уцягненьня новых укладчыкаў у ашчадкасы.

У 4-м квартале г. г. ашчадкасы раёну атрымалі адліў на 15876 руб.

Слаба праходзіць мобілізацыя сродкаў і праз сыстэму райспажыўсаюзу. Плян за 4-ы квартал выканан усяго на 21,7 проц. Прычынай такога адставаньня зьяўляецца дрэнная перабудова работы коопэрацыі па-новаму.

Акрамя гэтага, марудна праходзіць падпіска на пазыку 3-га рашаючага. Усяго завербавана падпішчыкаў на 557 тысяч руб., з прычыны бязьдзейнасьці фінапарату рэгулярнае паступленьне ўзносаў зрываецца. Паступіла ўсяго 96 тысяч руб., і гэта толькі ад гарадзкога насельніцтва.

Бязьдзейнічаюць у распаўсюджваньні пазыкі Мялешкаўскі, Аучнікоўскі, Першамайскі і інш. сельсаветы Слуцкага раёну, за ўвесь час не мобілізаваўшы ніводнага рубля на пазыку.

Надалей такое становішча нецярпіма. Неабходны рашучы пералом.

Я. Канончык

ВЫКЛІК ЧЫРВО[НА]ПАЛАУЦАЎ ПРЫНЯТЫ

Выклік чырвонапольскай [ком]соліі на ліквідацыю прарыву [вы]кананьні фінпляну 4-га кв[артала] і на хутчэйшае зьняцьце [з] чарапахі дадзенага Карм[янскага] раёну „Колгасьнікам Беларусі“ камсамолія Кармянскага раёну мае і з свайго боку, вы[конвае] наступныя мерапрыемствы:

а) Уключаемся ў 2-х д[..] штурму фінэстафэты, абвеш[..] РК КП(б)Б і РВК з мэтай па[..] хова выканаць фінплян к [..] сьнежня. Усю організацыю [..]чаем у армію фінэстафэты 20-га сьнежня накіроўваем у 20 чал. комсамольскага актыв[у] дапамогі ячэйкам.

б) Пераводзім 10-ць бук[сірных] брыгад з перадавых у адст[аючыя] ячэйкі і сельсаветы раёну.

в) Па рэалізацыі падпіс[кі на] пазыку 3-га рашаючага году [..]годкі бярэм на сябе аба[вязак] кожны комсамолец распаўсю[дзіць] пазыкі на 25 руб., што [..] дадатковай падпісьсі на 20000 [..]

г) Абавязваем кожнага [ком]мольца уступіць у ашча[дкасы] і завербаваць 2-х беспартый[ных] 5-ць лепшых комсамольцаў [мобілі]зуем на сталую работу у се[льскія] ашчадкасы.

Арбітрам соцспаборніцтва [пра]пануем абраць „Чырвоную зь[мену]“ і „Колгасьнік Беларусі“

Сакратар Кармянскага РК Л[КСМБ] Астапен[ка]

Лепшых ударнікаў—прэміяваць

У Высоцкім сельсавеце (Шк[..] раён) шырока разгорнута фі[нэста]фэта. Пры сельсавеце створан [..] з 37 асоб, а на вёсках і кол[гасах] організаваны брыгады.

У выніку ўдарнай работы с[ель]савету, партыйных і комсамол[ьскіх] ячэек абавязковыя плацяжы [па] падатку выкананы на 86 проц[.], страхоўцы на 82 проц. Пад[піска] на пазыку 3-га рашаючага с[ярод] служачых выканана на 116 [проц.] і сярод колгасьнікаў на 74 [проц.]

Паасобныя брыгады мобілі[зацыі] фінансавых сродкаў паказа[лі] узоры добрай ра[боты]. Напрыклад, брыгада вёскі Лов[..] дабілася выкананьня абавязко[вых] плацяжоў на 100 проц.

Лепшых брыгадзіраў фін[эста]фэты прэзыдыум сельсавету п[аста]навіў прэміяваць.

М. Мядзьведзе[ў]

Толькі 50 проц. пл[я]ну жывёлазагатов[ак]

На Случчыне ігноруецца паст[анова] лістападаўскага пленуму [ЦК] КП(б)Б аб 70 проц. выкананьн[і] 1-му сьнежня планаў жывёлазагатовак. У вогуле плян выканан [ус]го на 50 проц.: буйнай рага[тай] жывёлы загатоўлена 74 проц., [ава]чак 16 проц. і сьвіней усяго [..] проц. Гэтыя лічбы сьведчаць [аб] бязьдзейнасьці слуцкіх загатоў[чых] організацый.

Райкоопсаюз і аддзяленьне [Саюз]мяса зрабіліся пасыўнымі пры[ём]шчыкамі жывёлы. Паасобныя с[ельсаве]ты ганебна бязьдзейнічаюць, зры[ва]ючы загатоўкі. Так, Сераскі с-сав[ет] выканаў плян усяго на 17,9 пр[оц.], Ісэрскі на 18,6 проц., Першама[йс]кі на 23,4 проц. і г. д.

Сьнежань—рашаючы месяц. Ра[ё]нныя організацыі, комсамольс[кія] ячэйкі павінны максімум увагі [у]даць справе жывёлазагатовак і [да]біцца 100 проц. выкананьня пл[я]наў у вызначаны тэрмін.

Брыгадзір „ЧЗ“ Канончык Я.

Л. Бэндэ

У барацьбе за вялікае бальшавіцкае мастацтва

Па шляху найбольшага супраціўленьня

Аб творчасьці Андрэя Александровіча

Беларуская пролетарская літаратура атрымала буйныя перамогі ў барацьбе за сваю гегемонію. Мы маем ня толькі колькасны рост продукцыі, але, асабліва трэба падкрэсьліць, рост якасны. Якасьць гэтай продукцыі ацэньваецца характарам і актуальнасьцю тэматыкі, мастацкім узроўнем, ідэёвай насычанасьцю, якая у сваю чаргу абумоўлівае сабою і актуальнасьць і мастацкі ўзровень.

Творы Андрэя Александровіча надзвычайна красамоўны сьведка гэтаму. Што найбольш характэрнага, найбольш цікаўнага ў двох апошніх творах гэтага пролетарскага поэта—творах „Нараджэньне Чалавека“ і „Напор“? Што ў іх таго, што робіць гэтыя творы творамі пролетарскай літаратуры, што дае права гаварыць ня толькі аб новым этапе ў творчасьці самога пісьменьніка, але аб больш высокім этапе беларускай пролетарскай літаратуры, выяўленьнем якога зьяўляюцца апошнія творы Александровіча?

Самае цікаўнае ў творчасьці Андрэя Александровіча гэта тое, што ён шчыльна падыйшоў да аўладаньня дыялектыка-матэрыялістычным творчым мэтодам, што ён змог асвоіць і здолеў часткова ўжыць у сваёй творчасьці некаторыя асноўныя моманты матэрыялістычнай дыялектыкі. Гэта ёсьць асноўны вынік, асноўная сума 10-цігадовага разьвіцьця Андрэя Александровіча. Гэта ёсьць тое, без чаго немагчыма далейшае разьвіцьцё і рост пісьменьніка. Гэта сума, гэты вынік абумоўліваюць і вызначаюць і ўзровень творчасьці і функцыі яе і актуальны характар яго творчасьці, бо аб актуальнасьці нельга судзіць па об'екту творчасьці пісьменьніка, а актуальнасьць ацэньваецца па той ідэёвай насычанасьці, па таму ідэёваму ўзроўню, як крышталізуецца ў даным об'екце, у данай тэме творчасьці пісьменьніка.

„Жыцьцё зьмяняецца, зьмяняюцца ідэі“—вось выходны пункт Александровіча ў яго творы „Нараджэньне чалавека“. Чалавек Александровіча гэта ня проста абстрактны чалавек-беларус наогул, чалавек з якога часта нашы поэты і пісьменьнікі выбівалі яго клясавую сутнасьць, у чым грэшны ў першыя часы сваёй творчасьці і Александровіч,—чалавек цяпер для Александровіча рэальны, жывы клясавы чалавек. Андрэй Александровіч праз прыватныя момманты, звычайныя і простыя характарызуе з ь я в і ш ч ы, разгортвае сутнасьць процэсу перапробкі чалавека, процэсу, які характарызуе культурную рэволюцыю. Рэволюцыя для Александровіча—гэта ня просты бег гісторыі, гэта ня просты бег цягніка, хай сабе ад Воршы да Унечы, а рэволюцыя для Александровіча — гэта складаны процэс ня толькі перапробкі экономікі, ня толькі перапробкі вытворчых людзкіх адносін, але і процэс перапробкі самога чалавека. Новы чалавек нараджаецца ў складаным процэсе жорсткай клясавай барацьбы у супярэчлівых абставінах; у абставінах, якія складаюцца з барацьбы антагоністычных сіл і тэндэнцый, у абставінах, у якіх перамагае новае, соцыялістычнае. Вось падыход пісьменьніка да сваёй тэмы. У гэтых абставінах з старога людзкога матар'ялу нараджаецца новы чалавек. Вось гэта ідэя і падыход да яе вырашэньня і ёсьць тое асноўнае, што характарызуе творы Андрэя Александровіча і ня толькі яго аднаго, а яно характарызуе ўвесь пролетарскі сэктар нашай літаратуры, твор Галавача — „Спалох на загонах“ і інш. Асноўнае, што характарызуе пролетарскую літаратуру—гэта імення такі падыход да сваёй тэмы. Праўда, такі падыход ня ёсьць ужо сформаваны але гэта тое вядучае асноўнае, што выяўляе здаровыя тэндэнцыі росту.

Гэроі Александровіча гэта не сузіральнікі і не рэфлектуючыя інтэлігенты, ня людзі, што калупаюцца у сваёй агідненькай інтэлігенцкай душонцы шукаючы разам з пісьменьнікам ў гэтых душонках „добрага, злога“. а гэта людзі класавай барацьбы, не залежна ад таго, ці усьведамляюць яны гэтага ці не. Менавіта тут у клясавай практыцы Андрэй Александровіч раскрывае сутнасьць самага чалавека. На справе ў клясавай барацьбе, той ці іншы гэрой Александровіча даводзіць правамернасьць сваіх ідэй, правярае наколькі правільна яго ідэя і наколькі надзейныя сродкі дасягненьня сваіх клясавых мэт. Праўда, об'ект твору „Нараджэньне чалавека“ мог быць інакшым больш значным. У выбары об'екту для свайго твору ляжыць асноўны недахоп данага твору. Аднак, ня гледзячы на гэта, пры ўсіх недахопах, гэта ня толькі актуальны, але „живо трепещущий“ твор, які валюе чытача, выклікае нянавісьць да клясавага ворага, выкрывае яго тактыку, мобілізуе увагу і пільнасьць да клясавага ворага, дапамагае асэнсіць процэсы клясавай барацьбы.

В а р т а спыніцца на тых недахопах, якія зьяўляюцца закономерным сьледзтвам недахопу ў сьветапоглядах, недахопу ў аўладаньні дыялектыкай у творчым мэтодзе Андрэя Александровіча. Твор „Нараджэньне чалавека“ зьяўляецца пераходным творам. У гэтым творы Андрэй Александровіч не пазбавіўся таго, на што хварэе яго „Поэма імя вызваленьня“. Так. досыць частыя зрывы ў бок простай рыфмоўкі, гукаў самых па сабе, у бок голага тэхніцызму—замест паглыбленага паказу, замест усебаковага разгортваньня вобразу, замест выяўленьня вядучых асноў, тэндэнцый у вобразе.

Не пазбавіўся Александровіч у гэтым сваім творы і трафарэтнасьці і непатрэбнай романтыкі, якая папаўняецца неапраўданымі ў творы ўздыхамі гэроя Паўла аб мінулым свайго краю, абсалютызаваньнем краіны, адсюль у наяўнасьці затушаваньне выразнай пэрспэктывы ў будучыню. Інакш кажучы, у „Нараджэньні чалавека“ яшчэ адчуваюцца сьляды нацыяналістычнай абмежаванай романтыкі, элементы якой знаходзілі сабе мейсца ў шэрагу твораў папярэдніх часоў творчасьці поэты.

Вось тыя асноўныя недахопы ў творы, якія зьяўляюцца ні чым іншым, як вынікам недахопу сьветапогляду, як вынікам таго, што А. Александровіч, стоячы на правільным шляху, на шляху аўладаньня марксыцка-ленінскай дыялектыкай, зрабіўшы ў гэтай справе значныя посьпехі, тым ня менш яшчэ ня ўзьняўся на такую ступень, каб разгарнуць процэс ва ўсёй савакупнасьці, з ўсіх яго бакоў, прапітаць яго духам бальшавіцкай партыйнасьці. Гэта што датычыцца „Нараджэньня чалавека“.

У значнай ступені пазбаўленым гэтых недахопаў зьяўляецца твор „Напор“. Гэты твор сьведчыць аб тым, што Андрэй Александровіч прасунуўся значна ўперад па шляху перамаганьня вузкасьці, мэханістычнасьці голага тэхніцызму, контрастнасьці схэмы, сьляды чаго ёсьць і ў „Нараджэньні чалавека“. У выніку гэтага глыбіня разгортваньня тэмы, паказ рабочага колектыву ў яго клясавай, у яго вытворчай практыцы, паказ росту сьвядомасьці кожнага члена рабочага колектыву куды больш, чым у папярэдніх творах. Большая ідэёвая насычанасьць, а значыць больш мастацкая якасьць, больш моцная больш эфектыўная функцыя гэтага твору.

Вы гатовы сустрэць навічка?

…ні сталінскага паходу, напярэдадні ўсебеларускай конфэрэнцыі школ ФЗВ—ударна правядзем суботнік, палепшым стан фабрычна-заводзкага вучнёўства

…омсамолія Беларусі дабілася значных посьпехаў на фронце будаўніцтва школ …В. …рганізоўваюцца новыя школы, якія ахопліваюць новыя дзесяткі і сотні дзяцей бо…х.

…днак, побач з дасягненьнямі ў пашырэньні сеткі школ ФЗВ і якасьці навучаньня …юцца недахопы. У некаторых школах дрэнна яшчэ пастаўлена тэорэтычна-вытвор… грамадзка-палітычнае выхаваньне вучняў (Жлобін, Шклоў).

…омсамолія яшчэ недастаткова змагаецца за паляпшаньне культбытавых умоў вучнікаў. Адміністрацыя цэлага раду прадпрыемстваў ня выканала пастанову партураду аб 15 проц. адводзе жыльлёвай плошчы пад ФЗВ. Ня выканан плян капі…га будаўніцтва г. г., у выніку няма выстарчальнае колькасьці жыльлёвай і …вай плошчы. У некаторых школах ФЗВ няма майстэрань, а калі ёсьць, дык … абсталяваны: не хапае цэлага раду інструмантаў і варштатаў.

…а ініцыятыве „Чырвонай зьмены“ і на падставе пастановы ЦБ ЛКСМБ, з 20 … сьнежня г. г. праводзіцца ўсебеларускі суботнік на карысьць непасрэднага аб…ланьня і організацыі майстэрань, рамонту інтэрнатаў. Задача комсамольскай орга…: на працягу 10 дзён забясьпечыць організацыю гэтых суботнікаў. Лёзунг: „…ож…камолец павінен адпрацаваць адзін дзень на карысьць ФЗВ“

…Школы ФЗВ шчыльна надыходзяць да новага набору. Комсамольскія організацыі …ы шырока разгарнуць падрыхтоўчую працу ў гэтым напрамку. Здаровымі школа… ФЗВ сустрэць новы набор!

АБГАВАРВАЕМ СТОБАЛЬНУЮ СЫСТЭМУ

Даві овіч—МШВ

Ад „Штрафнога журналу—да вучотнае карткі ўдарнікаў

Прачытаўшы артыкулы т. Крымскага аб выніках правядзеньня стобальнай сыстэмы па МШВ, я лічу, што ён ня зусім правільна зразумеў гэта пытаньне.

Я, як вучань МШВ, магу сказаць, што стобальная сыстэма ў працы школы дала значны зрух; зьнізіліся прагулы, узьнялася працдысцыпліна. Але… бальная сыстэма мае нешта падобнае да штрафнога журналу, пры існаваньні якога большасьць вучняў ня цікавілася заняткамі. Мы ня можам сказаць што стобальная сыстэма зьяўляецца вучотнаю карткай ударніка.

Прапаную склікаць вытворчую нараду школьнага актыву ФЗВ г. Менску, на якой абмеркаваць той вопыт, які маюць некаторыя школы пры пераходзе на стобальную сыстэму.

т. т. Гарбачэнка, Баркун—Менск

Сыстэму пераапрацаваць

— Бясспрэчна, што ўлік праробленай працы адыгрывае вялікую ролю ў выяўленьні таго як працуе той ці іншы вучань, ці зьяўляецца ён сапраўдным ударнікам.

Мы хочам спыніцца толькі на адной сыстэме вучоту—стобальнай сыстэме. Па нашай думцы, у стобальнай сыстэме больш адмоўных бакоў, чым дадатных.

Чаму?

Па-першае, таму, што пры правядзеньні стобальнай сыстэмы змазваецца палітычная сутнасьць соцспаборніцтва і ўдарніцтва, а па-другое, уся энэргія і энтузіязм вучняў накіроўваецца на барацьбу за балы і нельга высьветліць хто з вучняў зьяўляецца ўдарнікам.

Адсюль відаць, што стобальную сыстэму патрэбна ў корані зьмяніць, пераапрацаваць і ні ў якім разе не праводзіць яе ў такім выглядзе, як гэта праводзіцца ў МШВ.

…ьвік—Менск

Я галасую супроць стобальнай сыстэмы

З увядзеньнем стобальнай сыстэмы у МШВ назіраюцца факты нядобрасумленных адносін вучняў да працы. Зусім правільна адзначылі таварышы, што вучань зьяўляецца на сход не па ўласнай сьвядомасьці, а толькі з-за баязьні, што з яго вылічаць некалькі балаў.

Б…ваюць выпадкі, што група каб захаваць большую колькасьць балаў, імкнуцца замазаць зробленыя імі ўчынкі. Прыклад на вучань другое клясы, т. Мурашка адлаў свой комсамольскі білет толькі з-за таго, што з яго зьнялі некалькі балаў, калі ён не зьявіўся на сход.

Таму я лічу, што мы комсамольцы—будучыя кваліфікаваныя рабочыя, павінны выхоўвацца не у абцугох,

Напярэдадні ўсебеларускай конфэрэнцыі

Конфэрэнцыя ФЗВ Віцебску

За…чыла працу Віцебская агульна-гарадзкая конфэрэнцыя …ЗВ. Конфэрэнцыя правяла агляд стану падрыхтоўкі …фікаваных кадраў праз сетку школ ФЗВ.

За …ошні час, у сувязі з падрыхтоўкай да конфэрэнцыі …нк…су на лепшы фабзавуч, ёсьць багата дасягненьняў. …блі… добрыя прыклады ў палепшаньні працы школы па…бзавуч металістых:

Ад…к гэта яшчэ не гаворыць аб тым, што ў працы школ …В у… добра. Самы галоўным недахоп—гэта тое, што гас…арч… і професыйныя організацыі недаацэньваюць значэньне …В. …сьць цэлы рад вучэбных і вытворчых непаладак (мала …тал…аньня, падручнікаў, няма інтэрнату).

Ко…самольская організацыя Віцебску яшчэ з большай ра…ас…ю павінна змагацца за палепшаньне працы ў школах …В.

А. Камінскі.

Тэмпамі чэрапашымі…

…завод „Домбаля“ поў…ьц… не забясьпечаны кваліфікаванай рабочай сілай. Няма …м…най брыгады, што вы… …штомесячнае недавы…а …е прамфіняплану на …ц.

…пастановай ВСНГБ намеча… бу…ўніцтва новага ФЗВ …ляк…аў пры заводзе …омбіля“.

…Пр…ялі набор вучняў. …ет… г. г. пачалі будаваць …зебі… корпус, закончыць яго трэ' было да 1-га верасьня 1931 г. Аднак, будаўніцтва ідзе чарапашымі тэмпамі бо кантора Белбуду ня выканала дагавору на пастаўку будматар'ялаў. Прызначаная для будаўніцтва ФЗВ цэгла перакінута на пабудову лазьні, новых будынкаў і г. д.

Заводакіраўніцтва не здолела забясьпечыць пабудову ФЗВ неабходнай колькасьцю рабочае сілы.

Крутаўцоў.

Конфэрэнцыя ФЗВ г. Бабруйску

Адбылася гарадзкая конфэрэнцыя школ ФЗВ г. Бабруйску. Ня лішнім будзе зараз падвесьці некаторыя вынікі працы школ ФЗВ, наколькі яны выканалі дырэктывы партыі і ўраду ў пытаньнях падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў.

Школы ФЗВ Бабруйску маюць значныя дасягненьні. Прыкладна, фабзавуч імя Сталіна за час існаваньня даў не адзін дзесятак добра кваліфікаваных сьлесароў, якія зараз працуюць на адказных вытворчых вучастках фабрык і заводаў.

Побач з гэтымі дасягненьнямі ёсьць і недахопы. Кепска пастаўлена вытворчае і грамадзка-палітычнае выхаваньне вучняў. Акадэмічная пасьпяховасьць вучняў ня можа здаволіць узросшыя запатрабаваньні, якія дыктуюцца тэхнічнай рэконструкцыяй фабрык і заводаў і будаўніцтва новых гігантаў.

Ня зусім добра пастаўлена культ-бытавое абслугоўваньне фабзавучнікаў. Напрыклад, вучні ФЗВ заводу імя Сталіна толькі раз у дзень карыстаюцца гарачай стравай. Сталай сталоўкі пры ФЗВ няма. Абеды прывозяцца з кухні-разьмеркавальніка і выдаюцца ў невялічкім брудным пакоі.

Пастановы партыі і ўраду аб забясьпечаньні фабзавучнікаў прамтаварамі ня выканаваны. Комсамольскія організацыі ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў вырашэньні гэтага пытаньня. Ня раз працаўнікі ФЗВ заводу імя Сталіна зьвярталіся ў сэктар забясьпечаньня ЦРК, аднак там увесь час адмаўлялі вучням у прамтаварах.

Школы ФЗВ г. Бабруйску павінны асаблівую увагу зьвярнуць на палепшаньне вытворчага і грамадзка-палітычнага выхаваньня ў школах ФЗВ, на далейшае палепшаньне культурна-бытавых умоў фабзавучнікаў.

Вось вынікі конфэрэнцыі.

Брыгада „Ч. 3“ Стальны. Ходас.

Павольна

…дуюцца і рамантуюцца інтэрнаты і майстэрні для …кол… ФЗВ. Хіба ня так адносяцца да будаўніцтва …кл…скага ФЗВ, Барысаўскага будвучу, рамонту м…стэрань і інтэрнату для ФЗВ „Ударніка“?

БЫЦЬ ПЕРАЛОМУ Ў ЖЛОБІНЕ!

Жлобінская школа ФЗВ чыгувачнікаў знаходзіцца ў надзвычай дрэнных умовах.

„Чырвоная зьмена“ (№284) біла трывогу і зьвяртала ўвагу партыйных, комсамольскіх, гаспадарчых і профэсыйных організацый на тое, што неабходна палепшыць якасьць тэорэтычнай вучобы і вытворчай практыкі, лепш абслужыць вучняў у культурна-бытавых адносінах і разгарнуць грамадзка-палітычную выхаваўчую працу ў школе ФЗВ.

Сыгналы „Чырвонай зьмены“ Жлобін пачуў. Факты пацьвердзіліся. Жлобін ускалыхнуўся. Нарада комсамольскага актыву цалі ўзялася за ФЗВ. Даём слова юнкорам:

т. т. Шаўцову і Загальскаму Н.

Аб стане працы ў Жлобінскай школе ФЗВ пісалася надзвычай многа. Апошнія факты, аб якіх пісала „Чырвоная Зьмена“, пацьвердзіліся. Комсамольскі колектыў цягі на нарадзе актыву абмеркаваў матар'ял „Чырвонай Зьмены“ і выявіў прычыны дрэннай працы школы.

Комсамольская і партыйная організацыі школы не клапаціліся аб тым, каб палепшыць яе працу і організаваць нармальную вучобу.

Гэта факт, што вучні яшчэ і цяпер знаходзяцца ў дрэнных культурна-бытавыхумовах. Не палепшылася грамадзкае харчаваньне і забясьпечаньне вучняў прамтаварамі.

Комсамольская організацыя зусім мала зрабіла для акомсамольваньня фабзавучу:

Такім чынам пералому няма.

Адбылася нарада… абмеркавалі становішча школы… выявілі вінаватых. напісалі рэзолюцыю…

Комсамолія Жлобіна можа і павінна зрабіць болей. Па рэбны тэрміновыя захады для палепшаньня працы ФЗВ. У бліжэйшыя дні чакаем матар'ялу ад раённага камітэту комсамолу, кіраўнікоў вузла партыйнай, комсамольскай і професыйнай організацый школы і адміністрацыі аб прынятых захадах, якія-б забясьпечылі пералом

паравоз і вагон

—недасяжная мэта для школ ФЗВ чыгункі. Кіраўніцтва вузла не дае, адміністрацыя і камсамол не змагаюцца.

„Хай сабе!“ кажуць яны.

Паляпшайце штодня вытворчую практыку!

Па ФЗВ БССР

(з юнкораўскіх лістоў)

…дарбудвуч (Бабруйск) уключыўся ў падрыхтоўку да ўсебеларускай конфэрэнцыі школ ФЗВ* Вучні ФЗВ чыгуначнікаў (Ворша) высунулі сустрэчны трансфінплян, зьнізілі прастой паравозаў у рамонце. * У ФЗВ фабрыкі „Спартак“ вялікі адсеў вучняў.

Школа дарбудвучу (Бабруйск) шырока разгарнула падрыхтоўчую працу да ўсебеларускай конфэрэнцыі школ ФЗВ. Зьнішчана ганебная пляма, якую школа мела ў тэорэтычна-вытворчым навучаньні. На гэты вучастак зьвернута максімум увагі з тым, каб да конфэрэнцыі прыйсьці з посьпехамі.

Наладжваецца праца ў майстэрнях. Школа ў хуткім часе атрымае 10 аўтомашын для рамонтнай практыкі. Частка вучняў ужо перакінута на практыку: язда на машыне, рамонт і г. д.

Паміж вучнямі разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Дарбудвуч амаль што акомсамолен, калі ня лічыць новага набору. Праводзіцца далейшая праца па ўцягненьню вучняў у рады комсамолу.

Брыгада „Ч. 3“ Гаварушка, Пратасеня.

* * *

Вучні ФЗВ чыгуначнікаў (Ворша), абгаварваючы трансфінплян 4-га квартану высунулі свой сустрэчны плян. Група рамонту цягнікоў замест заданьня адрамантаваць 8 цягнікоў высунула сустрэчную лічбу: 10. Фабзавучнікі з посьпехам выконваюць узятыя на сябе абавязкі.

Значна зьнізіўся прастой паравозаў у рамонце (абточцы). Замест пляну 4-6 дзён, машына прастойвае толькі 4-5.

Недапушчаць прастою паравоза ў рамонце звыш вызначанай нормы, дабіцца эканоміі матар'ялу і сродкаў на 5 проц., акомсамоліць групу і г. д.—такая задача фабзавучнікаў.

Сэкр. ячэйкі Валодзін.

* * *

Школа ФЗВ фабрыкі „Спартак“ (Шклоў) знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане. Партыйны і комсамольскія колектывы абмежаваліся голым абсьледаваньнем школы і паперовымі рэзолюцыямі, за выкананьне якіх ніхто ня думае брацца.

Не лепш з культбытавымі ўмовамі. Адзіны інтэрнат не адпавядае свайму прызначэньню, і знаходзіцца за 2 з пал. кілёмэтры ад школы.

Кепска пастаўлена і тэорэтычна-вытворчае навучаньне: школа ня мае сваіх сталых настаўнікаў,

Усё гэта разам узятае спрыяе вялікай цякучасьці вучняў: з 82 чал. засталося 47

Фабзавучнік.

УВАГА!

Выклікаюцца ў рэдакцыю для перагавораў па справах „старонкі фабзавучніка“ сэкратары комсамольскіх ячэек і колектываў, а таксама члены рэдкалегій наступных колектываў: ФЗВКІМ, МШВ, ФЗВ зав. „Ударнік“, будвучу Белдзяржбуду, ФЗВ сувязі і ФЗВ „Камунаркі“.

Просьба зьявіцца на працягу 3-х дзён 21, 22 і 23 сьнежня з 9 да 4-ай гадзіны дня.

СЬВЯТЛО І ЦЕНІ аднаго ФЗВ

Мы стаім напярэдадні ўсебеларускай конфэрэнцыі школ ФЗВ. У конфэрэнцыі, а …так…а ў конкурсе, які праходзіць напярэдадні конфэрэнцыі …дзельнічаюць усе фаб…зав…ы рэспубліканскай прамысловасьці БССР.

Сёньня гутарка будзе аб ФЗВ заводу „Ударнік“. Гэты ФЗВ дабіўся значных дасягненьняў у сваёй рабоце, але ён мае і багата недахопа… давайце выслухаем, што …кажуць аб сваім ФЗВ самі юнкоры ўдарнікі-фабзавучнікі.

Такім чынам, даем слова т. т. Гарбачэнка, Баркуну, Маго і юнкору Нароч:

— …кола па-ўдарнаму рыхтуецца да першай усебеларускай конфэрэнцыі ФЗВ.

З 1…а сьнежня пераведзены …а гаспадарчы разрахунак лі…ейны… цэх, зараз рыхтуюцца да …ерав…у лепшыя брыгады сьля …арна… цэху. Комсамольскі ко…екты… уключыўся ў сталінскі …аход… разгарнулася праверка …аго. адміністрацыя і гаспа…арчы… організацыі праводзяць …жыц…цё шэсьць умоў т. Сталіна.

У …кным цэху наладжан рэ…уляр…ы выпуск штодзенных …асьц…газэт. Школа ўключыла…я ў …лдагаворную компанію, вылучаны брыгадзіры па праверцы колумовы.

Але адміністрацыя школы ніякай увагі не зьвяртае на ўмовы працы вучняў. Асабліва гэта адчуваецца ў ліцейным цэху, дзе цесна, цёмна, няма вэнтыляцыі. Вучні ў час адліўкі задыхаюцца ад пылу, дыму, газу і гарачыні. Каб праветрыць цэх, прыходзіцца адчыняць усе вокны і дзьверы, таму вучні хварэюць. Вельмі вялікія каўшы для разноскі чыгуна і часта для нашых вучняў не пад сілу.

Вучні шкодных профэсій павінны атрымоўваць падвышаную зарплату, але адміністрацыя гэтым пытаньнем не зацікавілася:

— Школьны інтэрнат знаходзіцца недалёка ад цэнтру гораду, у памяшканьні былой сынагогі. Там знаходзяцца 28 вучняў. У інтэрнаце ня лепш, чым у ліцейнай: цеснота, бруд, антысанітарыя.

Загадчык інтэрнату адкладвае рамонт. На заўвагу вучняў, ён адказвае:—„Вам жывецца лепш, як маёй цёцы…“

Нам невядома, ці жывуць інтэрнатаўцы „Ударніка“ лепш цёткі загадчыка. Нам вя…ма толькі тое, што ФЗВ мае ўсе магчымасьці стварыць людзкія ўмовы для працы і …ыцьця вучняў.

Фабзавуч уключыўся ў сталінскі паход, разгарнуў калдогаворную кампанію, соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Лепшым падарункам да конфэрэнцыі будзе адрамантаваны інтэрнат, палепшаньне харчаваньня і забясьпечаньне вучняў, вэнтыляцыя ў майстэрнях і лепшая організацыя працы.

Старонка фабзавучніка № 3

Даць добры абед фабзавучнікам

Комсамольскі колектыў ФЗВ Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату дасягнуў конкрэтных вынікаў у палепшаньні харчаваньня фабзавучнікаў

Палепшаньне харчаваньня фабзавучнікаў, гэтай галоўнай крыніцы падрыхтоўкі кадраў, на сёньнешні дзень паўстала рубам.

Рад гаспадарчых організацый не забясьпечыў адных такіх умоў, якія-б спрыялі падрыхтоўцы новых кадраў для папаўненьня вытворчасьці.

У многіх ФЗВ яшчэ дагэтуль не наладжана забясьпечаньне фабзавучнікаў гарачым сьнеданьнем і вячэрай, ня рэдкі выпадкі, калі не хапае абедаў.

Комсамольскія організацыі ФЗВ бязуважна адносяцца да палепшаньня добрабыту вучняў.

Добры прыклад паказаў колектыў Бабруйскага дрэваапрацоўчага ФЗВ. Пры актыўным удзеле комсамольскай організацыі адчынена пры школе сталоўка, якая сваёй узорнаю працай заняла зараз першае месца.

Вопыт працы Бабруйскага комбінату павінен быць пераняты ўсімі комсамольскімі організацыямі ФЗВ.

Неадкладна перабудавацца

Пастанову пленуму ЦК УсеКП(б) аб грамадзкім харчаваньні не рэалізуе сталоўка-кухня—разьмеркавальнік № 23.

Па палажэньню сталоўка павінна быць паказальнай ва ўсіх напрамках. Па-першае, таму што пры ёй маецца ФЗВ кулінараў, які павінен вучыцца там добрым прыкладам у працы. А, па-другое, што яна—адна з буйнейшых у Менску і задача яе: забясьпечваць абедамі больш 5 тысяч рабочых.

Сталоўка выпускае абеды дрэннай якасьці. Фабзавучнікі ня маюць магчымасьці атрымоўваць гарачыя сьнеданьні раніцай і ўвечары. З-за недахопу абедаў у сталоўцы заўсёды вялікі шум.

Антысанітарыя—звычайная тут зьява. Лыжак не хапае. Крэслы амаль што ўсе паламаны.

Адміністрацыя сталоўкі, а таксама і комсамольскі колектыў ФЗВ не паставілі перад сабой задачу перабудаваць працу сталоўкі згодна апошніх пастаноў партыі.

Трэба зараз-жа прыступіць да карэннай перабудовы працы сталоўкі, прыстасаваўшы яе конкрэтна да задач пасьпяховага завяршэньня 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Юнкор-брыгада імя Ўсесаюзнай конфэрэнцыі ФЗВ Лабашаў, Драніца.

Дарбудвуч на правох бяспрытульнага

Забясьпечаньне ФЗВ дарбудвучу (Бабруйск) пастаўлена з рук вон дрэнна. Школа налічвае 200 вучняў, але дагэтуль ня мае сваёй сталоўкі. Абеды дастаўляюцца дрэннай якасьці і часта бываюць недавараныя.

Здараюцца часта зрывы заняткаў і практыкі з-за несвоечасовай дастаўкі абедаў.

БЦРК дрэнна забясьпечвае дарбудвуч продуктамі і прамтаварамі Да гэтага часу школа не прыкапавана да закрытага разьмеркавальніка.

Комсамольскі колектыў пытаньнямі палепшаньня дабрабыту ФЗВ не займаецца.

Так далей быць ня можа. На дарбудвуч, як школу падрыхтоўкі кадраў, павінна быць зьвернута ўвага грамадзкасьці, асабліва комсамольскай організацыі.

Брыгада друку: Пратасеня Т., Гагарушка Я.

Керамічны ФЗВ патрабуе да сябе ўвагі

Праца керамічнага ФЗВ у Копысі не пастаўлена на належную вышыню, асабліва ў галіне харчаваньня і забясьпечаньня вучняў.

Адміністрацыя школы не зьвяртае ўвагі на тое, што вучні ня маючы абутку і вопраткі, не наведваюць школу. Харчуюцца вучні ў агульнай сталоўцы, але абедаў часта не хапае.

Комсамольская організацыя школы, а таксама і райком комсамолу не падумалі аб тым, каб палепшыць харчаваньне і забясьпечаньне фабзавучнікаў.

А. Розанцаў.

Сталоўка ФЗВ—узорна у сваёй працы

Рэйд юнкораў ФЗВ Бабруйскага дрэваапрацоўчага комбінату, організаваны „Чырвонай зьменай“ у час падрыхтоўкі да зьлёту юнкораў ФЗВ па адной з сталінскіх умоў, галоўным чынам накіраваў сваю ўвагу на палепшаньне грамадзкага харчаваньня.

Зьлёт вынес пастанову: дамагацца хутчэйшага адчыненьня сталовай пры ФЗВ.

Комсамольскі колектыў разам з адміністрацыяй узьнялі хадайніцтва перад дырэкцыяй камбінату аб адкрыцьці сталовай.

У сучасны момант сталоўка адчынена. Якасьць абеду добрая, чыстата ў сталоўцы здавальняючая.

Комсамольцы зараз узялі шэфства над сталоўкай, каб яшчэ лепш наладзіць яе працу.

У далейшым неабходна дабіцца каб сталоўка адпускала фабзавучнікам, якія жывуць у інтэрнатах, гарачыя сьнеданьні.

Юнкор-брыгада „Ч. З“ Салько Л. і Іванейчык В.

З за неналаджанасьці ў працы заўсёды таўханіна

У сталоўцы на заводзе „Ударнік“ дзе харчуецца ФЗВ разам з рабочымі заводу, праца пастаўлена вельмі дрэнна.

За абедамі заўсёды вялікая чарга, таўханіна, таго і глядзі, што выльлеш на галаву суп ці што іншае. Памяшканьне малое і не ўмяшчае ўсіх сталаўнікоў. Сталоўка атрымлівае абеды з кухні-разьмеркавальніка № 23, якасьць якіх нікуды ня варта.

Для фабзавучнікаў кожны дзень не хапае 20-30 абедаў з-за чаго ўзьнікаюць частыя спрэчкі.

Комсамольскі колектыў наладжваньнем працы сталоўкі не займаўся.

Неабходна дабіцца, каб кухню, якую будуюць пры заводзе, як мага хутчэй скончылі, што дасьць магчымасьць у корані перабудаваць працу сталоўкі.

Мазо.

Па сьлядох Японіі францускія войскі займаюць провінцыю Гуаньсі

ТОКІЁ. 17. З Кантону паведамляюць, што францускія войскі ў Інда-Кітаі перайшлі мяжу провінцыі Гуаньсі пад прадлогам прасьледваньня „бандытаў“ і комуністых. У сувязі з гэтым паведамляюць, што кантонскі ўрад нібыта думае пратэставаць.

Яўгень Чэн рыхтуе ноту францускаму пасланьніку Вільдэну. Паведамляюць, што кантонскі ўрад адначасова запрапанаваў Лі-Цунь-Жэню (галоўнакамандуючы войскамі Гуаньсійскай провінцыі) умацніць прымежную ахову Гуань-сі і аказаць супраціўленьне францускім войскам.

Японскі стаўленік у Мукдэне прымае меры супроць Цзінжоўскага ўраду

ТОКІЁ. 17. Як павядамляюць, новы старшыня мукдэнскага ўраду Цан-Шы-І абвясьціў, што прыме „меры“ у адносінах цзінжоўскага ўраду пры дапамозе консультацыі а таксама супрацоўніцтва з Ховдыё“.

Як паведамляе газэта „Асахі“ з Мукдэна, урад Цан-Шы-І паведаміць Чан-Сюэ-Ляна аб тым, што ён недапушчае існаваньня цзінчжоўскага ўраду на Мукдэнскай тэрыторыі.

Заява Чжан-Сюэ-Ляна аб магчымасьці перагавораў з Японіяй

ТОКІЁ, 17. Агенства „Сінбун рэнго“, спасылаючыся на аўторытэтныя крыніцы, паведамляе з Бэйпіна аб заяве Чжан-Сюэ-Ляна нанкінскаму ўраду, быццам ён „спадзяецца на тое, што ў бліжэйшы час пачнуцца непасрэдныя перамовы з Японіяй“.

Разгортваем творчы агляд маладзёжнай літаратуры

21-га сьнежня, а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ склікаецца

нарада па пытаньнях творчага агляду маладзёжнай літаратуры

На нараду запрашаюцца т. т.: Рубінчык (ЦК ЛКСМБ), П. Галавач, М. Лынькоў, М. Чарот, Я. Лімаоўскі (БелАПП), А. Сянкевіч, К. Чорны (БелФАСП), А. Александровіч, П. Швэйдэль, Ал. Кучар (МенАПП), Вэндэ (БелЛАЧАФ), І. Бронштэйн, І. Харык, Ліберман (яўсэкцыя БелАПП), А. Рымашэўскі, А. Гараўскі (польсэкцыя БелАПП), Б. Палей (прадстаўніцтва „Ком. правды“) Фрумкіна, (Менгарком ЛКСМБ). Вайнштэйн („Юнгэр Арбэйтэр“), С. Ліхадзіеўскі, В. Каваль, Б. Мікуліч (ячэйка ЛКСМБ пісьменьнікаў), І. Дуброўскі (Юндзетсэктар ДВБ), члены „Чырвоназьменаўскай“ літаратурнай брыгады, рабочыя-ўдарнікі, заклікаўныя ў літаратуру прадстаўнікі рэдакцый літаратурна-мастацкіх часопісаў.

Просьба зьявіцца без спазьненьня.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“

Усім організацыям ЛКСМБ

ІУ пленум ЦК комсамолу Беларусі пераносіцца з раней вызнач... чысла і адбудзецца 27-га сьнежня 1931 г.

На Пленум ЦК выклікаюцца члены і кандыдаты ЦК і рэвіз... камісіі сакратары райкамолаў.

Там, дзе будуць райпартконфэрэнцыі ў час Пленуму ЦК, сакр...ры гэтых райкамолаў павінны застацца на райпартконфэрэнцыях.

Сакратар ЦК ЛКСМБ Палякоў

Узмацніць удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве

Пастанова Бюро Менгаркому ЛКСМБ ад 13-га сьнежня 1931 г. аб вялікадзяржаўнай і антысэміцкай вылазцы на заводзе „Комунар“

1. На аснове рашучага і пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай політыкі партыі ў непрымірымай і бязьлітаснай барацьбе за яе прынцыповую чыстату супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць контррэволюцыйнага беларускага нацыянал-дэмократызму, нацыянал-опортунізму і масцовага шовінізму рабочая кляса і шырокія масы працоўных пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі дабіліся велізарнейшых посьпехаў у будаўніцтве нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па свайму зьместу культуры.

2. Сучасны пераход характарызуецца значнай актывізацыяй контррэволюцыйных клясава-варожых элемэнтаў, у асаблівасьці на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Аб гэтым з усёй відавочнасьцю сьведчаць апошнія вылазкі вялікадзяржаўных шовіністых з наскокамі на ленінскую нацыянальную політыку партыі. Яскравым прыкладам гэтаму зьяўляецца вялікадзяржаўная і антысэміцкая вылазка на заводзе „Комунар“.

Махровы вялікадзяржаўны шовініст, антысэміт Піткевіч—член партыі, рабочы токарнага цэху—у пададзенай ГК КП(б)Б заяве яўна паклёпнічаў на нацыянальную політыку, якую праводзіць партыя. Партыйная ячэйка токарнага цэху пры разглядзе гэтай заявы Піткевіча недаацаніла чорнасоценнай яе сутнасьці, прымірэнча аднеслася да яе, ня ўзьняўшы гэтую справу на належную прынцыповую політычную вышыню, не мобілізаваўшы ўвагу рабочых вакол яе, ня даўшы бальшавіцкага адпору клясава-варожаму выступленьню Піткевіча. Партячэйка разглядзела заяву Піткевіча на зачыненым сходзе, куды ня былі дапушчаны нават комсамольцы.

3. Бюро КСМ колектыву заводу „Комунар“ на працягу амаль 2-х месяцаў замоўчвала гэта пытаньне, не рэагавала на вылазкі клясава-варожых элемэнтаў вялікадзяржаўнага шовінізму і контррэволюцыйнага антысэмітызму, не мобілізавала вакол гэтага конкрэтнага факту ўвагу КСМ організацыі. І гэта ў той час, калі на заводзе „Комунар“ у мінулым мелі месца антысэміцкія, шовіністычныя выпадкі.

4. Комсамольская організацыя заводу „Комунар“ яшчэ і да гэтага часу нічога не зрабіла для правядзеньня 2-х месячніку беларусізацыі, нават не абгаварыла гэта пытаньне. Ігнараваньне кіраўніцтвам комсамольскай організацыі заводу „Комунар“ 2-х месячніку беларусізацыі вынікае з опортуністычнай недаацэнкі важнасьці яго, а таксама з тэй надзвычай слабой работы, якую праводзіць комсамольская організацыя па нацыянальна-культурнаму будаўніцтву сярод моладзі нацменшасьцяй. Беларускаю мовай значная частка актыву, комсамольцаў карыстаюцца толькі на паседжаньнях, сходах. Не наладжана вывучэньне сярод комсамольцаў і рэшты моладзі гісторыі, эканомікі, культуры Беларусі. Работай організаванага літаратурнага гуртка, заклікам ударнікаў у літаратуру бюро колектыву займалася зусім незавальняюча. Бюро КСМ колектыву не рэагавала на недапушчальны факт выключэньня з програмы навучаньня асобных курсаў заводзкага тэхнікуму беларускае мовы.

Бюро Гаркому ЛКСМБ, цалкам і поўнасьцю далучаючыся да ...вятых Гаркомам КП(б)Б раш... па сутнасьці вялікадзяржаўна... тысэміцкай вылазкі на заво... мунар“, а таксама расцэн... адносіны кіраўніцтва КСМ ко... ву заводу „Комунар“ вялі... жаўнай антысэміцкай вылазк... заводзе як яўна недапушча... прымірэнства, бюро Гаркому Л... пастанаўляе:

1. За несвоечасовае рэагав... на вылазкі вялікадзяржаўнага ш... вінізму і контррэволюцыйнага ан... тысэмітызму з боку клясава-вар... жых элемэнтаў, за слабое інт... цыянальнае выхаваньне мола... неразгорнутасьць работы сярод... ладзі нацменшасьцяй, за нера... нутасьць работы сярод моладзі... меншасьцяй, за неразгорнут... работы па 2-х масячніку бела... зацыі—бюро колектыву „Кому... абвясьціць вымову. Культпроп... ро колектыву заводу „Комун... т. Шэндэровіча—з работы з...

2. Катэгорычна прапанаваць... ро КСМ колектыву заводу „... нар“ зараз-жа разгарнуць ... па 2-х месячніку беларусі... распрацаваць конкрэтныя ме... ерпрыемствы, якія-б забясьпечвалі ... ную рэалізацыю рашэньняў ... ЛКСМБ. На працягу дэкады пр... ці па цэхах сходы комсамольц... ўсёй моладзі заводу, на якіх ... ка растлумачыць клясава-вар... сутнасьць вялікадзяржаўнага ... нізму, як галоўнай небясьпекі ... даным этапе, сутнасьць конт... люцыйнага антысэмітызму. ... КСМ колектыву прыняць рап... захады па наладжваньню р... сярод моладзі нацменшасьцяй.

4. Вялікадзяржаўная, анты... кая вылазка клясава-варожых ... мэнтаў на заводзе „Комунар“, ... тысэміцкая вылазка на з... „Ударнік“, вялікадзяржаўную ... лазку ў радзе навучальных ус... сыгналізуюць аб неабходнасьці ... мацніць політычнае выхав... комсамольцаў. Бюро Гаркому Л... абавязвае ўсе комсамольскія ... нізацыі скарыстаць з гэтых ... крэтных фактаў неабходныя ... тычныя ўрокі, узмацніць бар... за ідэёвую чыстату радоў ... скага комсамолу, за бальшав... выхаваньне комсамольцаў, за ... чае змаганьне супроць вялікадзяр... жаўнага шовінізму—галоўнай ... бясьпекі на даным этапе, не ... лабляючы барацьбы з белар... контррэволюцыйным нацдэмо... тызмам і шовінізмамі розных к... раў, узмацніўшы барацьбу з гн... лібэралізмам, трацкісцкім ко... бандызмам, якія актывізуюц... тэорэтычным фронце.

Прапанаваць усім колекты... ячэйкам на працягу дэкады на ... цыяльных сходах комсамольц... ўсёй моладзі прапрацаваць пы... не аб нацыянальнай політыцы ... тыі увязаўшы яго з меўшымі ... вылазкамі на заводзе „Комунар“ ... ў навучальных установах, пра... мобілізаваць увагу комсамольц... ўсёй моладзі на павышэньне ў... лу ў нацыянальна-культурным ... даўніцтве, на рашучую бара... супроць адхіленьняў ад ленінс... нацыянальнай політыкі партыі.

5. Бюро Гаркому ЛКСМБ абав... вае культпроп ГК КСМ прасач... за выкананьнем гэтае пастано... а таксама праверыць ход выкана... ня пастановы сакратарыяту Гар... му КСМ ад 9 сьнежня 1931 г.

Адказны рэдактар Л. ПЭРЛІН

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.